Па тэрыторыі заказніка па старому тракту пракладзены цікавы экалагічны маршрут, па якому можна адправіцца як пешшу, так і ў велапаход.



У мясцовага насельніцтва асобай папулярнасцю карыстаюцца багатыя вітамінамі журавіны, дурніцы, якія растуць на балоце.





“Дзікае” – гэта месца, дзе расце вялікая колькасць лекавых раслін, якія ўдалечыні ад забруджанай глебы з’яўляюцца практычна экалагічна чыстымі.

Калі зірнуць на “Дзікае” з вышыні птушынага палёту, вачам адкрыецца дзіўная карціна, насычаная сакавітымі фарбамі, якая радуе погляд разнастайнымі адценнямі. Спрыяльнае асяроддзе для пастаянных насельнікаў і сезонных, пералётных гасцей. Аазіс у зялёным моры Белавежскай пушчы.

Балота для нас – яшчэ неадкрытая скарбніца, адкуль мы можам чэрпаць звесткі не толькі аб мінулых ландшафтах, але і пазнаць нашу гісторыю. Гэту гістарычную кнігу можна чытаць бясконца, старонку за старонкай, робячы ўсё новыя і новыя адкрыцці.



**ДУК “Свіслацкая раённая бібліятэка”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынга**

# Самае "дзікае" балота ў свеце



**Свіслач 2016**




Усяго тэрыторыя балота “Дзікае” займае 15206 га, у тым ліку на Свіслаччыне – 9374 га, 5832 га – у Пружанскім раёне.

Большая яго частка ўваходзіць у нацыянальны парк “Белавежская пушча”, якая ўключана ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Балота “Дзікае” – равеснік егіпецкіх пірамід. Узрост састаўляе больш за шэсць тысяч год.

На тэрыторыі балота “Дзікае” расце 14 відаў раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі. Тут сустракаюцца такія рэдкія, экзатычныя расліны, як венерын чаравічак, які з’яўляецца родналсным трапічнай архідэі, шпажнік чарапічны (дзікі гладыёлус).







Адзначаны цэлы шэраг рэгіянальна рэдкіх відаў раслін. Гэта цісдалія галасцябельная, вужоўнік звычайны, водазбор звычайны, любка двулісная, пальчатакарэннік майскі, бяроза нізкая.

Фауна пазваночных дастаткова разнастайная і ўключае 28 відаў млекакормячых, 4 віды паўзуноў і 5 відаў амфібій.



На тэрыторыі балота адзначана рэдкая ў Белавежскай пушчы рысь.

Асаблівае значэнне Дзікае мае для захавання ў нацыянальным парку абарыгеннай папуляцыі лася.

На балоце водзіцца 99 відаў птушак, 14 з іх занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі. Сярод апошніх – барадатая кугакаўка і пугач – віды, якія маюць нацыянальнае значэнне. Тут абітае каля 8% еўрапейскай папуляцыі вяртлявай чаротаўкі – 1200-1500 пяючых самцоў.



У вадаёмах балота “Дзікае” адзначана 19 відаў рыб, якія адносяцца да 5 сямействаў.

У наваколлі балота “Дзікае” растуць і лясы, але склад іх не аднародны. Высокім узростам адрозніваюцца сосны (узрост 117 гадоў), елкі (124 гады), дубы (124 года), ясень (94года).

Па эфектыўнасці ачысткі атмасферы ад вуглякіслага газа і абагачэнню яе кіслародам балота “Дзікае” эквівалентнае 100–120 тысячам гектарам лесу.

